**25.** Вызначце, у якіх прыкладах з прыведзеных парушаны марфалагічныя нормы:

*1) старэйшы за яго; 2) без чэрг; 3) пяццю; 4) карані.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** 1, 3. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 2, 4.

**26.** У склад якога слова ўвайшлі запазычаныя з грэчаскай мовы словы *autos*, *bios*, *grapho*?

**А)** аўтограф. **Б)** афарызм. **В)** аўтабіяграфія. **Г)** манаграфія. **Д)** арфаграфія.

**27.** Якімі спосабамі рыфмоўкі карыстаюцца паэты пры вершаскладанні? Выберыце патрэбныя варыянты з прыведзеных:

*1) простая; 2) парная; 3) састаўная; 4) кальцавая; 5) перакрыжаваная; 6) дакладная.*

**А)** усе варыянты. **Б)** 1, 3, 6. **В)** 1, 2, 4. **Г)** 2, 3, 6. **Д)** 2, 4, 5.

**28.** Калі ўпершыню з’явіўся ў старажытнай беларускай літаратуры тэрмін ***верш***?

**А)** на пачатку XIV стагоддзя. **Б)** на пачатку XV стагоддзя.
**В)** на пачатку XVI стагоддзя. **Г)** на пачатку XVII стагоддзя.
Д) на пачатку XVIII стагоддзя.

**29.** У якіх сказах з прыведзеных ёсць моўныя недакладнасці?

*1) Аленка навучылася ад маці пячы смачныя бліны з грэцкай мукі.*
*2) Міхась доўга чакаў сябра, трымаючы лыжы ад марозу рукамі.*
*3) У кузні Янка з цікавасцю назіраў, як дзед з лёгкасцю браў у рукі кувалду і пачынаў працу.*
*4) Хлапчукі адразу паверылі, што кратэр утварыўся ў даўнія часы ад падзення метэораў.*
*5) Для вопытаў вучні прынеслі драўняны вугаль.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма памылак. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4, 5. **Д)** толькі 4.

**30.** Дадзены ўрыўкі з твораў вядомых беларускіх паэтаў:



*1) З легендаў і казак былых пакаленняў …;*
*2) Здароў, марозны звонкі вечар …;*
*3) Зайграй, зайграй, хлопча малы …;*
*4) Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа …;*
*5) Родная мова, цудоўная мова! Ты нашых думак уток і аснова!..;*
*6) Мова, пявучая родная мова, ты – уладарка нявызнаных скарбаў …;*
*7) З усіх дарог я, край мой любы, заўжды вярнуся да цябе…*

Дадзены аўтары: *а) Зарыцкі; б) Пазнякоў; в) Дубоўка; г) Танк; д) Караткевіч; е) Багдановіч; ё) Багрым.*

Калі правільна вызначыце прозвішча аўтара, каму належыць выказванне, і ўпішаце ў патрэбныя клеткі, то ў выдзеленым радку прачытаеце назву твора, які быў напісаны Каятанам Марашэўскім і лічыцца найбольш значным помнікам беларускага пісьменства XVIII ст.

**А)** 1-ё, 2-г, 3-в, 4-б, 5-д, 6-е, 7-а. **Б)** 1-г, 2-е, 3-ё, 4-д, 5-в, 6-а, 7-б.
**В)** 1-в, 2-е, 3-ё, 4-а, 5-д, 6-г, 7-б. **Г)** 1-д, 2-г, 3-а, 4-б, 5-ё, 6-е, 7-в.
**Д)** 1-г, 2-ё, 3-а, 4-в, 5-б, 6-е, 7-д.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА.*
*тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01; e-mail: info@bakonkurs.org*
*http://www.bakonkurs.org/*

ГА «БА «Конкурс». Заказ 11. Тыраж 27500 экз. г. Мінск. 2008 г.

# Конкурс па беларускай мове
# “БУСЛІК-2008”

*Чацвер, 21 лютага 2008 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Вызначце правільна напісанае слова:

**А)** светафор. **Б)** святлафор. **В)** светлафор. **Г)** святлафар. **Д)** святафор.

**2.** Выберыце толькі ветлівыя звароты:

*1) добры дзень; 2) чытай; 3) калі ласка; 4) смачна есці; 5) сядзь тут; 6) у аўторак.*

**А)** 1, 3. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 3, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 5, 6.

**3.** У якіх словах замест пропуску не ўставіце літару ***я***?

*1) с..ржант; 2) б..да; 3) г..рой; 4) вос..мсот; 5) ц..жкаваты; 6) в..сляр.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 3, 4. **Г)** 4, 5. **Д)** 2, 5, 6.

**4.** Сымонка падбіраў да назоўнікаў адпаведныя прыметнікі. Атрымаліся словазлучэнні: *1) гліняная глеба; 2) лясістыя кветкі; 3) цікаўны артыкул; 4) чалавечны род.* Якія словазлучэнні хлопчык запісаў няправільна?

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 4.

**5.** Якога слова не хапае ў фразеалагізме ***да … поту***?

**А)** працоўнага. **Б)** гультайскага. **В)** зманлівага. **Г)** пятага. **Д)** сёмага.

**6.** У беларускага паэта М. Пазнякова ёсць загадка:

*Сябры, пабраўшыся за рукі,*
*Вядуць усіх нас да навукі.*
*Яны – у кнізе і ў газеце,*
*І іх павінны ведаць дзеці.*

Знайдзіце адгадку ў пераблытаных літарах.

**А)** р, і, п, к, д, а, і, ч, у, н. **Б)** ў, к, с, і, н, о, і, к.
**В)** і, р, ы, т, л, а. **Г)** і, л, а, к, м, ю, н. **Д)** н, і, к, і, г.

**7.** Колькі займеннікаў ужыў вядомы пісьменнік Я. Скрыган у сваім выказванні: *«Кожны з нас збіраўся выбраць самую шчаслівую пуцявіну і пайсці па ёй праз усё жыццё»*?

**А)** няма займеннікаў. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**8.** У якіх фразеалагізмах з прапанаваных ужыты лічэбнікі?

*1) Месца сабе не знаходзіць.* *2) Ісці на свой хлеб.* *3) На адной назе.*
*4) Як дзве кроплі вады.* *5) Зямлі не чуць пад сабою.* *6) За сямю замкамі.*

**А)** няма лічэбнікаў. **Б)** ва ўсіх фразеалагізмах ужыты лічэбнікі.
**В)** 1, 2, 5. **Г)** 3, 4, 6. **Д)** толькі 4.

**9.** Дадзена слова ***добры***. Выберыце да гэтага слова антонімы з ніжэй прыведзеных слоў:

*1) чужы; 2) благі; 3) спагадлівы; 4) родны; 5) сумны; 6) далёкі.*

**А)** няма антонімаў. **Б)** 1, 2, 6. **В)** 2. **Г)** 3, 4, 5. **Д)** 6.

**10.** На рускай мове гэта кветка называецца *анютины глазки*. А як па-беларуску? Выберыце назвы гэтай кветкі з прыведзеных ніжэй слоў:

*1) махвіцы; 2) гайнік; 3) расіца;*
*4) трайцвет; 5) браткі; 6) медуніца.*

**А)** 1, 6. **Б)** 1, 4, 5. **В)** 2, 4. **Г)** 2, 3, 6. **Д)** 4, 5.

**11.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску трэба напісаць літару ***ы***?

*1) р..зюме; 2) інт..лект; 3) інж..нер; 4) д..рэктар; 5) вет..ран;*
*6) партр..тыст; 7) інц..дэнт; 8) д..станцыя; 9) гард..роб.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2, 5, 7. **В)** 2, 3, 4, 6. **Г)** 3, 4, 7, 8. **Д)** 4, 6, 8, 9.

**12.** Разгадайце рэбусы і вызначце толькі назвы птушак.

*1)* 


*2)* 


*3)* 


*4)* 

*5)* 


**А)** усе назвы птушак. **Б)** няма назваў птушак. **В)** 1, 3, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 2, 3, 4.

**13.** У беларускага паэта Сяргея Грахоўскага ёсць наступныя вершаваныя радкі:

*Чалавеку патрэбна не слава,*
*А людская ўвага і ласка,*
*І сардэчнае цёплае слова,*
*І вясёлая добрая …*

Якога слова не хапае?

**А)** гутарка. **Б)** бяседа. **В)** казка. **Г)** парада. **Д)** гісторыя.

**14.** Якія знакі прыпынку неабходна паставіць на месцы пропускаў у сказе: *Снуючыся высока ў небе _ раняла птушка мяккія _ ласкавыя мелодыі _ сатканыя са звону срэбраных струн _ з бульканця лясных ручайкоў _ з зумкання пчаліных крыльцаў _ шолаху красак.* (Я. Колас)?

**А)** два працяжнікі, двукроп'е, тры коскі. **Б)** тры коскі, двукроп'е, дзве коскі.
**В)** шэсць косак. **Г)** чатыры коскі, два працяжнікі.
**Д)** знакі прыпынку не патрэбны.

**15.** У якім(-іх) сказе(-ах) з прапанаваных няправільна падкрэслены дзейнік:

*1) Снягі вакол.* *2) Вунь след.*
*3) Маша з сяброўкай прыйшла на заняткі гуртка.* *4) Крупнік здаўна гатавалі ў печы.*

**А)** няма памылак. **Б)** 1, 2, 4. **В)** толькі 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** Дадзены словы: *1) штораз; 2) утраіх; 3) бягом; 4) дадому; 5) нараўне; 6) надта.* Вызначце толькі прыслоўі.

**А)** усе словы. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 4. **Г)** 3, 5, 6. **Д)** 3, 6.

**17.** У правапісе якіх дзеясловаў з прыведзеных ёсць памылкі ў напісанні канчаткаў?

*1) чытаеце; 2) пасадзеце; 3) пераможыце; 4) бежаце; 5) ходзіце.*

**А)** ва ўсіх дзеясловах. **Б)** няма памылак. **В)** 1, 2, 5. **Г)** 2, 3, 4. **Д)** 3, 5.

**18.** ***Фразеалагічныя спалучэнні*** – гэта …

**А)** устойлівыя спалучэнні слоў з адзіным цэласным значэннем.
**Б)** устойлівыя трапныя народныя выслоўі з павучальным зместам.
**В)** трапныя вобразныя выслоўі пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў.
**Г)** устойлівыя адзінкі, сэнс якіх непасрэдна вынікае са значэнняў слоў-кампанентаў.
**Д)** устойлівыя спалучэнні слоў, значэнне якіх можна вывесці толькі з пераносных значэнняў слоў-кампанентаў.

**19.** У якіх прыкладах напішаце часціцу ***не*** асобна?

*1) У тэатр прыйшоў (не) старэйшы, а малодшы брат.*
*2) Вучань (не) давыканаў заданне.*
*3) У пакоі засталіся толькі (не) пабеленыя сцены.*
*4) Дзверы ў пакой (не) зачынены.*
*5) Маша зусім (не) лепш чытала.*
*6) Янку было надта (не) прыемна за свой учынак.*

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** 1, 2, 6. **В)** 1, 4, 5. **Г)** 2, 3, 6. **Д)** 2, 4, 6.

**20.** Дадзены лічэбнікі: *1) трэці; 2) дзевяцьтысячны; 3) чатырохсоты; 4) дзевяноста чацвёрты; 5) пяць тысяч сёмы*. Які парадкавы лічэбнік запісаны няправільна?

**А)** усе парадкавыя лічэбнікі запісаны правільна.
**Б)** 1, 3, 4, 6. **В)** 2. **Г)** 2, 4, 5, 6. **Д)** 5.

**21.** Якая літара для абазначэння мяккасці зычнага адсутнічала ў старабеларускім пісьменстве?

**А)** і. **Б)** я. **В)** ю. **Г)** ё. **Д)** е.

**22.** Вядомы беларускі пясняр Янка Купала ўспамінаў, што важнае для яго пытанне, на якой мове пісаць, было вырашана пасля таго, як трапілі яму ў рукі беларускія творы… Чые творы на беларускай мове зрабілі ўплыў на Я. Купалу?

**А)** Тараса Шаўчэнкі. **Б)** Кастуся Каліноўскага. **В)** Язэпа Пушчы.
**Г)** Максіма Гарэцкага. **Д)** В. Дуніна-Марцінкевіча.

**23.** Якую форму множнага ліку мае назоўнік ***чалавек***?

**А)** чалавекі. **Б)** народ. **В)** людзі. **Г)** натоўп. **Д)** грамадства.

**24.** Алесь лепш за ўсіх разгадваў у класе загадкі. А вось над шарадай, якую яму загадалі сябры, задумаўся, бо не ведаў нават значэння гэтага слова. Дапамажыце Алесю выбраць правільнае значэнне слова ***шарада***:

**А)** перастаноўка літар у слове, пры якой атрымліваецца новае слова.
**Б)** загадка, у якой загаданае слова падзяляецца на часткі, кожная з якіх – самастойнае слова, якое трэба адгадаць, каб атрымалася галоўнае слова.
**В)** загадкі, у якіх з загаданага слова шляхам замены літары на другую ўтвараецца новае слова.
**Г)** кароткае іншасказальнае апісанне якога-небудзь прадмета, з'явы, якія трэба пазнаць, адгадаць.
**Д)** загадкі, для разгадвання якіх трэба адшукаць загаданае слова і ўтварыць ад яго новыя словы адгадкі перастаноўкаю або выкідваннем асобных складоў ці літар.